

ГАЛАЛЁД – НЕ НАГОДА ДЛЯ ТРАЎМАЎ

11

САПРАЎДНЫ СІНАТРА НАВЕДАЎ БРЭСТ



12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 СТУДЗЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 8 (28875)

**ЛІЧБА ДНЯ**

## Больш за 2 тысячы

*нецвярозых кіроўцаў прыцягнула да адказнасці Дзяржаўтаінспекцыя Мінска ў 2018 годзе. А за паўторнае такое парушэнне на працягу года — больш за 100. Пры гэтым па віне кіроўцаў у алкагольным ап'яненні ў Мінску адбылося 16 ДТЗ з пацярпелымі, а 29 здарэнняў — па віне п'яных пешаходаў. Як адзначылі ў Дзяржаўтаінспекцыі, у асобных з гэтых выпадкаў у аўто знаходзіліся дзеці. Сёлета ДАІ Мінска 12—13 студзеня праводзіла спецыяльныя мерапрыемствы для прафілактыкі падобных ДТЗ. У выніку былі спынены 15 нецвярозых кіроўцаў.*



# У КОЛЕ РОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ



**Адным з першых на Лепельшчыне ў аграсядзібны рух уключыўся Васіль ШКІНДЗЕР. Настаўнік матэматыкі і фізікі на сваім падвор'і стварыў унікальную сядзібу-музей з ухілам на этнаграфію і народныя традыцыі і назваў свой турыстычны аб'ект па назве вёскі — «Поўсвіж». Ужо дзесяць гадоў запар гаспадар праводзіць на сядзібе беларускія народныя і мясцовыя абрады — «Жаніцьбу Цярэшкі», «Каляды», «Гуканне вясны», «Вялікодных валачобнікі», «Купалле». А яшчэ навучыўся іграць на старажытнай дудзе, аднаўляе і рамантуе старыя рэчы, якія маюць гістарычную і культурную каштоўнасць. Летась у рэспубліканскім конкурсе аграсядзіб за свой праект Васіль Шкіндзер быў прызнаны пераможцам у намінацыі «Захаванне традыцый».**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- **У Клічаўскім раёне адрадзілі традыцыйны абрад «Куры», адзіны дзіцячы калядны абрад, які захаваўся ў Беларусі. Ён уключаны ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны краіны.**



- Сталічныя ратавальнікі заклікаюць мінчан не загрувашчваць асабістымі аўто праезды да дамоў.
- **У студзені 2019 года гродзенскія мытнікі выявілі звыш 120 спроб незаконнага перамяшчэння алкаголю.**
- У Беларусі чорны спіс гульняманаў будзе дзейнічаць і для анлайн-казіно.

ISSN 1990 - 763X




# Ратавальнік у кішэні

**Тры гады таму ў мабільнай краме Google Play Market з'явілася бясплатная праграма, створаная Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях. Яна атрымала назву «Дапамога побач». За гэты час мабільнага памочніка спампавалі больш за 135 тысяч разоў. Ды і сама праграма пастаянна ўдасканальваецца па пажаданнях карыстальнікаў. У краме Play Market праграма набірае адзнаку 4,6 з 5 магчымых балаў. Пра тое, што ж новага з'явіцца ў мабільнай праграме ад Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, расказаў памочнік міністра МНС Віталь НАВІЦКІ.**




— Пакуль што нашай праграмай можна карыстацца толькі ўладальнікам смартфонаў, якія працуюць на базе аперацыйнай сістэмы Android. Разам з тым мы тры гады вывучалі рынак і прыйшлі да высновы, што ёсць сэнс зрабіць версію і пад аперацыйную сістэму iOS, якая ўстаноўлена ў апаратах кампаніі Apple. Распрацоўка гэтай версіі знаходзіцца ўжо на фінальным этапе. Мяркуем запусціць яе ўжо ў лютым — сакавіку. Праўда, пакуль функцыянал праграмы будзе даступны часткова. Разам з Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа мы яго паступова дапрацуем, і ён нічым не будзе адрозніваца ад версіі для Android.

Структура мабільнай праграмы простая. Адразу пры яе адкрыцці з'яўляецца невялічкае меню з шасці пунктаў. Самы папулярны раздзел у карыстальнікаў — гэта «Небяспечныя з'явы надвор'я». Ён уяўляе сабой карту, з дапамогай якой ратавальнікі паведамляюць аб непагадзі ў кожнай з шасці абласцей і ў Мінску і даюць адпаведныя рэкамендацыі.

СТАР. 3

Майстар-клас

# БЫЦЬ У ТРЭНДЗЕ

## На які ўрок вучні пабягуць з радасцю?

**«Вы можаце не змяняцца. Выжыванне — справа добраахвотная», — гэтыя словы вядомага вучонага і спецыяліста ў галіне менеджменту якасці Уільяма Дэмінга як мага лепш падыходзяць да сучаснай школы. Вучыць пакаленне Z — задача няпростая: паспрабуйце заваладаць увагай дзяцей, для якіх не існуе ніякіх аўтарытэтаў і якія ўпэўнены, што ўсё, што ім трэба, можна знайсці ці ўдакладніць у сецівe, таму навошта штосьці запамінаць? Яны не будуць слухаць доўга маналог настаўніка. Нельга прыйсці ў клас, штосьці ім расказаць, а потым патрабаваць, каб дзеці гэту інфармацыю паўтарылі. Ранейшыя педагагічныя прыёмы ўжо не працуюць — трэба гэта прызнаць і вучыцца разам са сваімі вучнямі. Бо ты маеш права вучыць, толькі пакуль сам вучышся...**

**Ці не таму Рэспубліканскі калядны фестываль педагагічнага майстэрства карыстаецца сярод педагогаў, якія цікавяцца апошнімі адукацыйнымі трэндамі, проста шалёным попытам. Пры гэтым удзел у ім — абсалютна добраахвотны... Ідэя яго правядзення належыць Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Беларускаму педагагічнаму таварыству.**

СТАР. 8



**Кацярына СКРЫГАН: «Мы можам запісваць штосьці ў сшыткі, а можам выразаць, клеіць і маляваць...»**